ЗЯЛЁНАЯ РАПСОДЫЯ

Як хораша таму на свеце жыць,
Хто мае мару — залатога друга.

Аляксей Зарыцкі

1

Пасля дажджу ў хвойніку высыпала столькі баравікоў, што ляснік ажно разгубіўся: хоць ты напраўду бяры касу ды касі. Яно, шчыра кажучы, у тутэйшых лясах ніколі не даводзілася шукаць грыб, як тую іголку ў сене, усё ж такое Аляксандр Піліпавіч бачыць упершыню. Ну, проста ступіць няма куды — столькі павылазіла іх з-пад

крохкай ігліцы. Нават у зарасніку, дзе разгаты арэшнік густа перапляла лаза-павітуха, і там тое самае: з-пад мінулагодняга лісця і пажухлай травы цэлымі сем'ямі выглядаюць крамяныя красунчыкі, нібыта цікуюць — возьмеш ці не.

І Аляксандр Піліпавіч нейкі час кленчыў пад разложыстай ялінай — зрэзваў сцізорыкам баравікі, а потым нанізваў іх бліжэй да ствала на сухое яловае голле — «вавёркам на зіму». Яго прадаўгаваты твар з трошкі прыпухлымі, як у маладой дзяўчыны, вуснамі, хітравата прыжмураныя карыя вочы, заўсёды заклапочаныя, нават крышку строгія, на гэты раз свяціліся вялікай радасцю — той самай, якая адначасова маладзіць і прыспешвае чалавека. «Вярнуцца, ці што?» — падумаў ляснік. І тут жа рашуча закінуў за плечы сваю нязменную спадарожніцу-дубальтоўку і спорным крокам падаўся ў бок вёскі.

А лес — маўклівы, пануры. Трапляюцца такія нетры, што і выбрацца адтуль, здаецца, немагчыма. Леснику ж — хоць бы што. Ідзе сабе напрасцяк, спакойны і ўпэўнены. Ніхто ў наваколлі лепш за яго, Аляксандра Гардзея, не ведае гэтыя мясціны. З маленства, як толькі памятае сябе, ён ходзіць гэтым лесам, ведае яго, як свае пальцы на руках. Таму і не дзіўна, што ва ўсе бакі праз балоты і нетры для яго праляглі тут сотні нябачных дарог-пуцявін. У вёсцы Мельнікі, дзе жыве Аляксандр Піліпавіч, ды і ў іншых навакольных вёсках добра ведаюць, як умее ён нечакана з'яўляцца ў любым кутку свайго абходу. Вось і цяпер мельнікоўскія хлапчукі нікольки не здзівіліся, калі перад імі, як з-пад зямлі, вырас дзядзька Алесь.

— Што ж гэта ў вас, хлопцы,— дакорліва паківаў галавою ляснік,— адны лаптушкі-рагатушкі на ўме? А грыбы за вас хто будзе збіраць?!

— Грыбы? Няма ж іх сёлета. Не ўрадзілі.

— Сухмень такая. Адкуль ім быць.

— Пракідаліся спачатку, а цяпер зусім не відно,— загаманілі шустрыя падлеткі, абступаючы Гардзея на ўзлеску.

— Эх вы, грыбнікі! А ну, гайда па кошыкі! І Ваську майму накажыце. На Залессі і ў Замошшы баравікоў хоць адбаўляй...

Іншы раз ад хлопцаў не адкараскаешся. Усё іх цікавіць: і чаму нельга раскідваць мурашнікі, і колькі яшчэ трэба зрабіць шпакоўняў для лесу, і калі, нарэшце, ство-

раць школьнае лясніцтва, і...— канца не будзе гэтым роспытам. Цяпер жа, прачуўшы пра баравікі, дзеці навыперадкі панесліся ў вёску, абіваючы на аксамітнай атаве густыя ранішнія росы.

Узлесак апусцеў, а Гардзей яшчэ доўга глядзеў услед басаногай чародцы, пакуль тая не схавалася ў вясковай вуліцы. Над Ланню, некім патрывожаныя, у роспачы мітусіліся крыклівыя кнігаўкі, назойліва патрабуючы адказу на сваё адвечнае пытанне: «Чые вы? Чые вы?» Да самай ракі падступаў маладзенькі бярозавы гай. Здавалася, што бярозкі знарок спыніліся паводдаль, каб не намачыць свае беленькія панчохі. А трошкі вышэй, на пагорку, апошнія дні любавалася высокім небам купка стромкіх сосен. Зацёс на іх быў размашысты, шырокі, нагадваў апярэнне гіганцкай стралы, скіраванай у зямлю. «Асуджаныя,— самотна ўздыхнуў ляснік.— Хто яе толькі прыдумаў, падсочку гэтую?». І зноў пайшоў у лес.

2

Апоўдні Аляксандр Піліпавіч збочыў з асветленай сонцам прасекі, сеў у засені, каб хвілін колькі супачыць, бо змогся ад спешнай хады. Па лесе галёкала вясёлае раскацістае рэха — перагукваліся вяскоўцы. Да звонкіх дзіцячых галасоў цяпер далучыліся залівістыя дзявочыя, глухаватыя мужчынскія — уся вёска ў грыбах. Па прасецы з дарослай паважнасцю «зваротным рэйсам» вярталіся дамоў дзеці. Хто з кошыкам у руках, а спрытнейшыя нават з мяшкамі за плячыма. І ў памяці лесніка міжволі ўваскрэслі дні яго маленства.

Яны жылі пры лесе, на хутары Касач. Сваёй зямлі — адна лапінка. Дарма што лес глядзеўся ў вокны, дроў у хаце і зімой, і ўлетку ні палена. Бо лес жа не свой, панскі. Тыя разы таксама трапляліся грыбныя гады. Але што толку. У лес не ступі, бо ён жа не абы-чый — пана Абуховіча. Неяк раз хлапчук-хутаранін уплёўся за вясковымі падлеткамі ў лес па грыбы. Перахітрылі панскага вартаўніка і нарэзалі-такі па цэламу кашу. Ідуць сабе дамоў, а ў гэты час сам Абуховіч — вярзіла з лупатымі, як у быка, вачыма — вяртаўся ўлегцы аднекуль з-за Лані. Рассыпаліся дзеці па лесе, а пан давай ганяцца за імі ды лупасіць бружмелевым пугаўём па чым патрапіць. Чацвёра дзяцей у рэчку загнаў, збіў на горкі яблык. Баравікі ж памясіў сваімі глянцаванымі ботамі.

— Не руш панскага, холера! — крычаў на ўвесь лес.

Ледзьве жывы прыплёўся тады Алесь да хаты. Калі хаваўся ў алешніку, парваў свае шарачковыя порткі, пабдзіраў да крыві босыя ногі і твар. Асабліва шкада было порткаў — адзіныя ж. Маці казала, што ім зносу не будзе.

— Не хадзі ў яго лес,— плакала яна, абмываючы запечаную кроў сына.— Хай яго ногі не ходзяць, крывасмока праклятага!

— А што ён — пасадзіў, пасеяў ці палажыў іх там, баравікі гэтыя?! — упарціўся Алесь, аблізваючы засмяглыя губы.

— Хай яго на покуце паложаць, вылюдка такога. Не хадзі, сынку.

А лес гукаў да сябе, пад свае шаты, спяваў таямнічую, казачную песню. І хлопчык ішоў. Амаль штодня, стаіўшыся ў кустах ядлоўцу, доўга цікаваў ён, як важна і ганарыста насілі па лесе свае сукаватыя рогі ласі, як асцярожна, нібыта босыя па суччу, падыходзілі да вадапою казулі, як бяздумна ўцякалі ў гушчар некім спалоханыя дзікі.

Толькі пятнаццацігадовым упершыню прыйшоў ён у лес смела, як на бацькоўскі двор. Гэта было ў незабыўным 1939 годзе. У тую памятную восень ніхто не забараняў хадзіць туды і не патрабаваў квіток на дазвол нарэзаць вядро апенек ці іншых грыбоў, якія да гэтага — столькі гадоў — марна гінулі ў лесе.

Тады і нарадзілася ў яго запаветная мара — расціць лясы. Для ўсіх. Каб кожны любаваўся іх дзівоснай прыгажосцю, мог прыходзіць сюды, калі схоча.

Алеська доўга блукаў баравінамі, сядзеў на месцы нядаўніх высечак, успамінаў недалёкае мінулае. Якіх толькі паноў і паненак не прыязджала сюды. З Варшавы, Кракава, Нясвіжа, нават з-за мяжы. І такіх танюсенькіх, як вясенні пабег вербалозу, і такіх мажных з выгляду, хоць і трухлявых нутром, як купчастыя вербы ля дарог. Паны весяліліся, любаваліся лесам, а ён, Алесь, баяўся зварухнуцца ў кустах ядлоўцу. Услед за панамі прыязджалі розныя падпанкі, пад корань высякалі лес і адпраўлялі немаведама куды — ці то ў Гдыню, ці то яшчэ далей. Стагнаў, плакаў тады стары бор. А разам з ім плакаў і Алесь.

Цяпер паны зніклі. Хутка і бясшумна, як совы на досвітку. Але совы знікаюць бясследна, а гэтыя, як стрэмку ў жывым целе, пакінулі пасля сябе балючы след — сотні

гектараў абязлесенай зямлі. Яшчэ не спарахнелі пні, а палі наўкола ўжо змарнелі, абмялела прыгажуня Лань.

— Буду расціць лясы. Толькі б даручылі.

3

Спакон вякоў дні шчасця і радасці здаюцца людзям сонечнымі, дні мірнай стваральнай працы — кароткімі, дні вайны — пахмурнымі і доўгімі, як ноч у бяссонніцу. Такімі засталіся ў памяці дні апошняй вайны — вялікага выпрабавання, вялікага гора народнага.

Яно прыйшло нечакана. Пагодлівы чэрвеньскі ранак абяцаў мельнікоўцам сонечны дзень. Уся вёска высыпала на вуліцу, у лес, да Лані. У паслухмяных руках Васілька Гайцюкевіча, вясковага ўмельца-чарадзея, наўздзіў мілагучна спявала дудка-берасцянка. Дзяўчаты падхапілі знаёмы матыў, і песня, такая ж звонкая, як навакольныя плёсы, паляцела над ціхай Ланню, над кашлатымі барамі і сонечнымі пералескамі:

Па лясу хаджу,
Па бярэзнічку.
Ой люлі, люлі,
Па бярэзнічку.

Звонкагалосае рэха сіганула за Лань, песня, перапоўненая чалавечай радасцю, узвілася ў блакіт, пад самае сонца. І здавалася, што яе чуе ўвесь свет:

Бяру ягадкі,
Буйны, салодкі.
Ой люлі, люлі,
Буйны, салодкі.

І раптам песня абарвалася. Недзе далёка-далёка, пад Клецкам, а мо і яшчэ далей, пад Нясвіжам, глуха ахнула зямля. На нейкі час нібыта знямела наваколле. У настоенае на баравым разнатраўі паветра паліўся едкі пах гару — пах вайны...

Люты вораг нішчыў усё на сваім шляху — гарады, вёскі, хутары. Цягнуў ён драпежную руку і да лесу. У вайну ніхто не лічыў парубак, на гэта неставала часу. Здаралася, што народным мсціўцам з атрадаў імя Варашылава і Шчорса, якія базіраваліся ў навакольных лясах, нават некалі было падлічыць свае ахвяры. Карнікі насядалі неадступна і доўга, пакуль не зразумелі прычыну няўлоўнасці партызан. І тады, як свечкі, успыхнулі хутары, запалалі вёскі. Дашчэнту былі спалены Свяцінц,

Макава, Мельнікі і Чудзіна. Дзве першыя вёскі карнікі спалілі з самалётаў, запальнымі бомбамі. У вёсцы Боркі за сувязь з партызанамі было расстраляна 39 і жывымі спалена 22 адважныя патрыёты. У Залужжы фашысты спалілі 100 дамоў і расстралялі 46 чалавек.

А ў хуткім часе глыбокай ноччу, пад самым носам аховы, партызаны праніклі да варожага гарнізона ў Дзяніскавічах, логава карнікаў, і закідалі яго гранатамі. Толькі лічаным эсэсаўцам, што адпачывалі там пасля карнай экспедыцыі, удалося ў сподніках уцячы ў Ганцавічы. Дзён праз колькі сярод белага дня партызанская група Уладзіміра Рыгоравіча Глеба на вачах у цэлага гарнізона карнікаў непадалёк ад Люсіна прама ў балота кульнула фашысцкі эшалон з танкамі, што накіроўваўся на фронт.

Захопнікі вар'яцелі ад злосці. Паўсюдна грымелі расстрэлы, скрыпелі шыбеніцы. А партызаны па-ранейшаму заставаліся няўлоўнымі. Амаль штодзённа гарэлі варожыя склады з боепрыпасамі і палівам, гарнізоны карнікаў і іх памагатых, на партызанскіх мінах узрываліся цягнікі і аўтамашыны. Абапал дарог, дзе фашысты прадбачліва знішчалі нават хмызнякі, цяпер рос новы лес — з бярозавых крыжоў.

Гэта быў час цяжкай і няроўнай барацьбы. Ішоў 1942 год. Карнікі атрымлівалі падмацаванне за падмацаваннем. Спачатку супраць партызан яны кідалі батальёны, крыху пазней палкі, а потым цэлыя дывізіі. Вораг прыкметна асмялеў і зноў прагна пацягнуўся ў лес. Яго вабілі мачтавыя сосны, гарэшчатыя дубы — незлічонае багацце і чаруючая прыгажосць тутэйшых лясоў...

На перахват першай падводы, што рушыла на Ясянец, партызаны спазніліся. Калі дабраліся да ўмоўленага месца, на адліжнай дарозе, як зашклёны, зіхацеў неглыбокі санны след. Стары бор памятае, як цяжка асунуўся тады на снег адзін з партызан.

— Праваронілі! — маркотна прашаптаў ён.

— Пайшлі! Хутчэй! — паклікаў другі і павёў толькі яму вядомымі лясными сцежкамі.

На раздарожжы яны сустрэліся — шасцёра фашыстаў і трое партызан.

...Стары бор памятае, як гадоў за дваццаць да таго тут адбылася яшчэ адна сустрэча. Тады невядомы мсцівец пільнаваў на гэтым месцы князя Радзівіла, які ехаў на брычцы таксама ў Ясянец. Але невядомага героя пера-

хітрыў стары князь. Сам ён сеў на козлы, а лёкая пасадзіў на сваё месца — ззаду. Трапная куля прадзіравіла спіну лёкая, а князь уратаваўся ўцёкамі. Даў такога драла, што ў Ясянцы не мог спыніць змакрэлага скакуна. На гэтым месцы — «за выратаванне душы княжацкай» — Радзівіл паставіў вялікі дубовы крыж. Фашыстам жа прыйшлося ставіць шэсць бярозавых крыжоў.

Многае, вельмі многае памятае стары бор: і баі ў акружэнні, і незабыўныя дні рэйкавай вайны. Тады партызанскі праваднік і разведчык Аляксандр Гардзей не ведаў спакою ні днём, ні ўначы. Як ні пільна ахоўвалі гітлераўцы чыгунку на ўчастку Баранавічы — Лунінец, усё ж менавіта тут адзін за адным спатыкаліся на партызанскіх мінах фашысцкія эшалоны, ляцелі пад адхон.

Нават самі акупанты называлі гэты ўчастак чыгункі могілкамі сваёй тэхнікі — танкаў, гармат, бронетранспарцёраў, аўтамашын. Між іншым, аж да гэтага часу спяваюць у навакольных вёсках вясёлыя прыпеўкі той незабыўнай партызанскай пары:

Э-э-х, лясы мае,
Лясы заланьскія.
Вас ахоўваюць атрады
Партызанскія.

Весялей іграй, гармонік,
Залатыя галасы.
Немцы нос баяцца сунуць
У заланьскія лясы.

У ліпені 1944 года патайнымі партызанскімі сцежкамі праводзіў Гардзей у тыл ворага наступаючыя часці Савецкай Арміі. Праводзіў ды і сам пайшоў на захад. За мужнасць і адвагу пры фарсіраванні Одэра, дзе асабліва спатрэбіліся партызанская загартоўка і навык няўлоўнага разведчыка, Аляксандр Піліпавіч быў адзначаны трэцяй за вайну ўрадавай узнагародай — медалем «За адвагу».

4

Цяжка паранены вярнуўся ён з вайны. Лес вітаў свайго сябра адвечнай шумлівай песняй, шчырай і да болю мілай. У лясніцтве, куды Аляксандр Піліпавіч адразу ж прыйшоў уладкоўвацца працаваць лесніком, яму не вельмі ўзрадаваліся. Падазрона пазіралі на мыліцы, на жоўты, як з воску, твар. Параілі:

— Адпачні крыху, набярыся сілы, а потым пабачым...

Праз тыдзень прыйшоў зноў. Без мыліц, абапіраючыся на кіёк. Ляснічы, маладзенькі, амаль што падлетак, засмяяўся:

— Дзівак ты, дарагі таварыш. Ну, які з цябе ляснік! Згубішся яшчэ дзе-небудзь у лесе, а потым шукай цябе...

Толькі на ганку Гардзей апамятаўся ад цяжкай крыўды. Сеў на прыступку і задумаўся. «Мо і сапраўды дзівак?.. Не, хлопцы! — сказаў уголас.— З лесам мяне цяпер ніхто не разлучыць».

У той жа дзень ляснічы сам прыехаў да Гардзея.

— Даруй, браце,— сказаў ляснічы вінавата.— Мне расказалі пра цябе леснікі. Даруй, калі ласка. Я буду вельмі рады, калі ты згодзішся працаваць у нас.

Нязручна было, пакуль загойваліся раны, кульгаць па нетрах ды балотах. То канава трапіцца — не пераскочыш, то сярдзіта заквохча, выгнецца ля самых ног дрыгва, гатовая ў любую хвіліну, пры першым жа промаху, расступіцца бяздоннай калатушай. Што і гаварыць, не разгуляешся ў лесе з кіёчкам!

Лес называюць зялёным золатам, родным домам чалавека. А ён яшчэ і лекар. Адменны лекар! У заланьскіх вёсках і цяпер жыве паданне пра тутэйшага гусляра сірату Карпея Кожана. Упадабаў яго нейкі князь, калі прыязджаў да Радзівіла на паляванне. Забраў гусляра з сабой і павёз у свой далёкі, стэпавы край. Было тады Карпею гадоў шаснаццаць. Праз год слугі таго князя прывезлі Кожана назад. Ніхто не пазнаў яго — скура ды косці засталіся на хлопцы. Князь вельмі шанаваў гусляра, і калі той цяжка захварэў, з усяго свету вазіў да яго дактароў. Аднак не памаглі і заморскія лекі. Тады князь спытаў у Карпея: «Скажы мне, што ты хочаш, я выканаю любое тваё жаданне?». «Адвязі мяне за Лань, у тую хатку ў бары, дзе я нарадзіўся і вырас»,— папрасіў гусляр.

Усе думалі, што гусляр памрэ. Нават хадзілі, каб пахаваць яго. Падышлі людзі аднойчы да той хаткі ў бары і сумеліся: Карпей сядзеў непадалёк пад дубам і ціха граў на гуслях. Так і пражыў ён у гэтым лесе яшчэ сто і семнаццаць гадоў. Лес гэты цяпер носіць яго імя, а ўрочышча называецца Кожанава.

У дзяцінстве Аляксандр Піліпавіч не вельмі верыў гэтаму паданню. А цяпер усё часцей пачынаў задумвацца над яго зместам. Мінула колькі часу, і ляснік па-ранейшаму адчуў ва ўсім целе незвычайную бадзёрасць — та-

кую калючую і свежую, як лясная крынічная вада... Калі ж пачалася пасадка новых лясоў, Гардзей першы паказаў незвычайны талент у гэтай справе. Меч Колесава, зручны сталёвы трохкутнік, так спрытна хадзіў у руках лесніка, што гэта адразу заўважылі. Яго дбайнасць ухвалілі, а потым даручылі спецыяльна займацца пасадкай лесу ў Круговіцкім лясніцтве.

Звычайна лес садзяць вясною. Мячом Колесава ў падрыхтаванай глебе робіцца лунка, у яе апускаецца саджанец дрэўца, корань засыпаецца зямлёй і — расці на здароўе. Скажаце, гэта вельмі проста? Нікольки! Трэба быць сапраўдным лесаводам, каб у пучку нітачак-карэньчыкаў распазнаць у дрэўца-малюткі цэнтральны, галоўны корань. Незнарок загнецца ён у лунцы — лічы, няма дрэўца. Праз пяць-дзесяць гадоў загіне шустрая сасонка, не пойдзе ў рост нашчадак лясных асілкаў — гарэшчаты дуб-зімняк, так і будзе журыцца, прысеўшы над зямлёй, яліна, зусім непадобная на сваіх гонкарослых сясцёр.

Пасаджаныя, выпеставаныя рукамі Гардзея дрэўцы не гінулі. Яны дружна цягнуліся к сонцу, пакідаючы на зямлі зялёныя цені. А ён садзіў і садзіў лес. І вясною, і ўвосень. І адзін, і разам з жонкаю, Надзеяй Данілаўнай, бо хто ж, як не яна, заўсёды побач. Спачатку па сорак, а пазней і па восемдзесят гектараў за пасадачны сезон. І не лічыў гектары, не выхваляўся імі, бо рабіў чалавек не дзеля ўласнай славы, пахвальбы і карысці. Ён, быццам тое дзіця, радаваўся, калі на нядаўняй бясплоднай пустэчы, на лысых пясчаных пагорках раслі, шырыліся жыватворныя цені. Лесавод ведаў, што гэта азначае: у лагчынах будуць бурліць паўнаводныя рэкі, на палях — каласіцца збажына, а ў паднябессі спрадвечнымі маршрутамі будуць штогод пралятаць пералётныя птушкі. Бо лес дае жыццё зямлі, зямля — людзям.

5

А як маркотна, як нясцерпна балюча станавілася на сэрцы, калі бачыў, як па-драпежніцку знішчаюцца лясы. Не вытрымаў — пайшоў у лясгас. Там яго далікатна выслухалі і ўважылі просьбу — зноў прызначылі лесніком.

Не паспеў Аляксандр Піліпавіч прыняць абход, як непадалёк ад Лані выявіў парубку. Нехта неўзаметку, на скорую руку, зрэзаў чатыры сасны і прыкрыў голлем, відаць, разлічваючы непрыкметна вывезці іх з лесу. Пры-

кінуў ляснік: заставацца тут і чакаць — дарэмная задума, бо даведаюцца, што самога дома няма, не паедуць у лес. Дамовіўся з Піліпам Ленкаўцом і Мікалаем Гайцюкевічам, леснікамі суседніх, лактышоўскіх абходаў, каб тыя павартавалі зрэзаныя сосны, а сам пайшоў у вёску.

Цэлы дзень корпаўся Гардзей каля свайго дома на віду ў людзей: рамантаваў падстрэшак, змяніў колле на прызбе, а ўвечары нават завітаў у краму, дзе ў гэты час звычайна збіралася шмат народу. Нехта з вяскоўцаў пацікавіўся:

— Што-та сёння, Піліпавіч, ад лесу адбіўся? Глядзі, каб не нашкодзілі там парубшчыкі!

— Не нашкодзяць! — наўмысна абыякава адказаў Гардзей.

— Што ж, каб чутае ды пабачыць.

— Пабачыце.

А раніцай уся вёска гаварыла пра парубшчыкаў. Злоўленыя на месцы злачынства Кастусь Гайцюкевіч і Аркадзь Ломскі дзён праз колькі стаялі перад народным судом.

Усё ж зацятыя хапугі ніяк не жадалі забываць дарогу ў лес, пускаліся на розныя хітрыкі. Дарэмна! Пільнае вока ў былога партызанскага разведчыка, не абвядзеш такога вакол пальца!

Неяк Мікалай Высоцкі ўсё-такі наважыўся быў перахітрыць лесніка: паехаў красці лес у час навальніцы. Перад гэтым сп'яна ён пахваляўся перад вяскоўцамі:

— От пабачыце, ашукаю Алеся. Не верыце? Як піць даць! Памянеце маё слова. І зусім лёгка ашукаю. Спадцішка.

— Лёгка, гаворыш? — смяяліся з Высоцкага.— Дарэмная задума. Лёгкае пяро, ды на страху не закінеш.

— А я закіну,— стаяў на сваім Высоцкі.

І вось ён у лесе. Завіхаецца сабе ля воза і не бачыць, што Гардзей ужо тут. Нарэшце заўважыў і натапырыўся, нібыта вожык, буркнуў сабе пад нос:

— Ведаеш, браце, хто ў лесе не злодзей, той дома не гаспадар. Даруй на гэты раз.

— Хлусіш наконт гаспадара! — прыкрыкнуў Аляксандр Піліпавіч.— Наадварот, хто ў лесе злодзей, той і дома не гаспадар. Паварочвай каня, паедзем у лясніцтва.

— У лясніцтва? — спалохаўся Мікалай.— Дык гэта ж верны штраф. А ў мяне, браце, сам ведаеш, жонка, дзеці.

— Ага, пра дзяцей успомніў. А колькі разоў я табе

гаварыў: на лес не ўзнімай руку — ён паслужыць і сыну і ўнуку...

З таго часу вось ужо каля трыццаці год у абходзе Аляксандра Гардзея не бывае самавольных парубак. Дваццаць год ягоны абход заслужана называецца абходам выдатнай якасці.

А ці ведаеце вы, што гэта такое — абход выдатнай якасці? Гэта, перш за ўсё, высокая культура ў лесе. Некалі Ф. Энгельс пісаў: «Лес — багацце краіны, а лясная гаспадарка — паказчык яе культуры». У абходзе выдатнай якасці, як у дбайнай гаспадыні ў доме, усё на сваім месцы, нішто не замінае. Вось так і ў абходзе Аляксандра Піліпавіча, на ўсёй цяперашняй плошчы — 1000 гектарах.

6

Значна цяжэй было змагацца з браканьерамі, такімі ж небяспечнымі для лесу, як і парубшчыкі. І гэтыя нішчаць з коранем. Але ім лягчэй замесці сляды свайго злачынства. Па-здрадніцку, з-за вугла апускаюць яны свой прагны, драпежны кулак на высокае, зялёнае чало прыроды. Грымне стрэл браканьера і — прыслухайцеся! — ахнуць, застогнуць ад цяжкай страты лясы.

А яны, браканьеры, яшчэ кпілі з лесніка:

— Ну, што ты, Піліпавіч, чапляешся, бы той дзядоўнік, ні за што ні пра што на ражон лезеш. Што іх, палічылі ў цябе, гэтых самых барсукоў, глушцоў ды гарыхвостак? Аж смешна. За кожны няшчасны мурашнік спуску не даеш ні дарослым, ні дзецям. Дзівак, дый годзе! Быццам сам не ведаеш, з якой асалодай куры клююць мурашак. Прывязеш іх на двор — лішні дзесятак яек у гаспадарцы. Ды якіх яек! Што тое лякарства...

Ляснік ведаў гэта. Але ён ведаў і іншае: чым больш у лесе дзічыны, чым больш мурашнікаў, тым здаравейшы лес, тым менш там лясных шкоднікаў. І ён нястомна тлумачыў гэта не толькі мельнікоўцам, але і ўсім людзям, што прыязджалі ў лес. Слухалі яго ўважліва. Дзівіліся і дарослыя, і дзеці, калі даведваліся ад Аляксандра Піліпавіча, што толькі адна вялікая калонія мурашак за дзень можа знішчыць да ста тысяч шкодных насякомых, а гарыхвостка за лета знішчае іх да мільёна штук. І людзі пачалі дапамагаць лесніку ахоўваць лес.

Гадоў пятнаццаць таму назад пагодным летнім днём

усё наваколле ўскалыхнула абуральная навіна: хтосьці з браканьераў параніў ласіху. Леснікі з ног збіліся, яе шукаючы. Не знайшлі. Рашылі, што загінула недзе ў балоце. А праз два дні мясцовыя школьнікі, лепшыя сябры лесніка, навялі яго на крывавы след. І пацягнуўся ланцужок людзей з зялёнымі пятліцамі — Аляксандр Гардзей, Піліп Ленкавец, Якаў Бондар і Віктар Тамашэўскі — па гэтаму следу. Злавілі ласіху і прывезлі ў вёску да фельчара. Тысячы людзей збегліся тады не столькі паглядзець, як пасля аперацыі адпускаюць на волю лясную прыгажуню — ласі тут не навіна,— колькі выказаць сваё рашучае абурэнне ўчынкамі браканьераў. У той дзень, «дзень страшнага суда над браканьерамі», як яго назвалі ў навакольных вёсках, многія зразумелі, што хадзіць на паляванне з фотаапаратам куды бяспечней, чым са стрэльбай у руках.

Таму і сёння да ціхай лясной Лані, дзе шчабоўкаюцца нястомныя будаўнікі-бабры, спакойна прыходзяць ласі і казулі, а наўсцяж яе нізкіх берагоў, у лясных нетрах жыруюць верныя сябры лесу — барсукі, гарнастаі, куніцы.

* * *

...Адвячоркам лясную цішыню абудзіў хапатлівы рокат матора. «Матацыкл. Можа, хто з нашых, лесаводаў?» — падумаў Аляксандр Піліпавіч і заспяшаўся на дарогу. Так яно і ёсць: здалёк пазнаў Салаўёва, работніка Ганцавіцкага лясгаса. Сустрэчы з гэтым вопытным лесаводам, які больш трыццаці пяці год свайго жыцця аддаў зялёнаму сябру людзей — лесу, заўсёды радасныя для Гардзея. Некалі ён вучыўся ў гэтага чалавека садзіць лясы, прарэджваць лесасекі, і ўдзячны яму, як вучань першаму любімаму настаўніку.

— Вітаю вас, Аляксандр Піліпавіч,— працягнуў руку Салаўёў.— Прыязджаў паглядзець ваш лесагадавальнік. Хутка будзем падводзіць вынікі спаборніцтва за камуністычныя адносіны да працы, вось і правяраем сёе-тое...

— У Ленкаўца сёлета лесагадавальнік, як лялька,— пахваліў Гардзей суседа па абходу.— Густы і роўненькі, як шчотка. О-о! — І ён высока ўзняў руку, адтапырваючы вялікі палец.

— У вас лепшы, Аляксандр Піліпавіч. Дзякуй вам, ад усяго сэрца дзякуй...

У апошні час у абходзе Аляксандра Гардзея не садзяць малады лес — няма плошчаў. Аднак і цяпер, калі славуты меч Колесава замянілі лесапасадачныя машыны, ляснік не можа, гаворачы яго словамі, сядзець, склаўшы рукі: у лесагадавальніку ён штогод вырошчвае для Хатыніцкага, Раздзялавіцкага і іншых лясніцтваў не менш мільёна саджанцаў сасны і ёлкі.

Мільён саджанцаў! Гэта ж на сто гектараў новых лясоў!

Развітваючыся, Салаўёў успомніў:

— Парадуйце, Аляксандр Піліпавіч, сваіх памочнікаў: дамовіліся стварыць школьнае лясніцтва пры вашай васьмігодцы.

— Вось гэта здорава! Эх, і рады ж будуць хлопцы! — мабыць, не менш тых хлопцаў узрадаваўся сам ляснік.

Ён пайшоў квартальнай прасекай, роўненькай, як струна. Пайшоў борздзенька, трушком. І мне здалося ў гэтую хвіліну, што дрэвы прыціхлі, выцягнуліся перад ім, нібыта салдаты на паверцы.

Усякае бывае ў жыцці. Мо і вам давядзецца ў дзесятым абходзе Круговіцкага лясніцтва спаткаць гэтага чалавека. Прашу вас: шчыра прывітайце яго. Успомніце: ён — уласнаручна! — пасадзіў 1126 гектараў лесу, вырасціў саджанцаў — на 1127 гектараў. Хіба ж ён не заслугоўвае, каб перад ім зняць шапку?